■ Простая мова

# НЕ ЎСЁ ТОЕ ЗОЛАТА...

**Вясна... Дзякаваць Богу, зноў!**
**І зноў нейчае невялічкае (маладое, напэўна?) сэрца не змясціла пачуццяў — пад вокнамі, на асфальце, белай фарбай напісана:** *«Варя, я люблю тебя!»*
**Шчасце гэта пачуць (а тым больш — ад каханага)! Яшчэ большае, відаць, — раніцай прачнуцца, зірнуць у акно і ўбачыць...**
**Прычым — не толькі Вары.**
**— Калі «р» у гэтым імені памяняць на «л», — кажу свайму чалавеку, — атрымаецца Валя...**
**— ...А калі на «н», — спакойна працягвае ён, — то Ваня...**
**Наколькі ведаю, смелыя цяпер дзяўчаты: самі тэлефануюць хлапцам (ды і жанатым мужчынам), самі прызначаюць спатканні, прызнаюцца ў пачуццях...**
**Добра, што не пішуць пакуль... На асфальце.**

## ЁСЦЬ ТАКОЕ ІМЯ!

Вёска, крамка, тройка бабуль — з размовай пра надзённае (хто памёр).

— Сціхнеце, хопіць! — абрывае жанчын прадавачка. — Можна падумаць, што ніхто не нараджаецца... У Сцяпаніхі ж праўнучка ёсць!

— Во... Прабабуляй стала і маўчыш? — нападаюць на яе кабеты. — Гэта што — у Ніны тваёй унучка?.. А калі ж нарадзілася?

— Трэці дзень ужо, — з гонарам прамаўляе бабуля. — У пятніцу, можа, з бальніцы выпішуць.

— А як жа назвалі? — цікавяцца вяскоўкі.

— Э-э-э... — заікаецца бабуля, потым неспадзеўкі забірае з прылаўка сумку і крочыць да выхаду.

— Мусіць, недачувае? — услед ёй шэптам пытае адна з жанчын.

— Не, — круціць галавой другая, — гэта малечу неяк на «э» назвалі — не то Элінай, не то Эвялінай. Сцяпаніха запомніць не можа: адна «шпаргалка» на халадзільніку ляжыць, другая — на тэлевізары.

## СЫТЫ ГАЛОДНАМУ НЕ СПАГАДАЕ?

Банальная гісторыя. Муж ад Раманаўны сышоў пазалетась (як данесла «разведка», да маладой) і, здавалася, з канцамі. Прынамсі, спачатку ён нават не званіў — дзецям, у дзень народзінаў (!).

Цяпер ужо іншая рэч: тэлефануе — і ім, і сваёй першай...

— Чаго?! — кожны раз абураецца тая.

— Мне паясніца баліць, — жаліцца муж.

— А я што табе — доктар?

— Не... Але, помніш, ты нечым такім націрала, і мне назаўтра лягчэла?

...Былой жонцы, з якой пражыў амаль трыццаць гадоў, выходзіць, прасцей расказаць пра нейкую больку, папрасіць парады.

А вось новай — той, што трыццаць ад роду, — складаней.

## ЧАРОЎНАЯ «ПАЛАЧКА»

Вечар. Кухня. Звычная тупаніна — пад звычны ж «фон»: тэлевізар уключаны, кіно ідзе — некалькі сюжэтных ліній там, нямала дзеючых асоб. А дзве — дык нават праўдзівыя, нібы з суседняй кватэры: жанчына гадоў сарака, якая цягне на сабе працу, дом, сірату пляменніцу і дачку-падлетка, ды муж яе — горкі п'яніца.

І — галоўнае — недурны ён, неблагі, нават любімы, але...

Як многія цяпер, гіне-прападае сам, губіць сям'ю — нідзе не працуе... І што толькі жонка ні робіць (з адчаю нават да экстрасэнсаў ідзе), а вынікаў — нуль, можна сказаць...

Ва ўсякім разе — было, на той час, пакуль ішоў тэлевізар. Потым прыйшлося выключыць. І толькі назаўтра ў прыяцелькі спытаць, чым жа ўсё завяршылася: ці кінуў той мужчына піць?

— Кінуў! — як за роднага ўзрадавалася кабета. — Уяўляеш: на яго дачку нейкія бандзюкі напалі. Ён давай ратаваць. Пачалася бойка. А тут якраз паліцыя... І, не разабраўшыся, хто тут хто, па галаве яму — дубінкай... Вось так і завязаў...

Не было б шчасця, як той казаў, ды няшчасце памагло! І якім жа чароўным чынам! Хутка... Проста... Даступна...

Грэх на душу, але ж каб так ды многім... Свет змяніўся б!

## ЧАГО ЧАКАЦЬ?

Надзея — рэч ненадзейная, але...

Баба Маня гадоў з 20 ужо ў азартныя гульні гуляе: штомесяц купляе латарэйныя білеты, потым мае клопат іх правяраць.

— Хочаце нешта выйграць? — пытаўся раней пляменнік (дзяцей ды ўнукаў у жанчыны няма).

— Не, — рукой махала бабуля, — не хачу, бо ўсё ў мяне ёсць. Але ж табліцы чакаць цікавей, чымся новай хваробы.

## АРЫФМЕТЫКА

Анекдот: «Мама, а дыназаўры ў нашай рэчцы вадзіліся?» — пытае дзіця. «Не ведаю, гэта ж даўно было. Ідзі папытайся ў бабулі».

Чыстая праўда: талончыкі на праезд у аўтобусах, тралейбусах, трамваях можна купіць у кіроўцаў. Асобныя з іх нават «раскладку» на кабінах павесілі. Кшталту: адзін талон каштуе 5500 рублёў, два — 11000, тры — 16500, чатыры...

Усё палічана, усё запісана.

Для тых, трэба разумець, хто не ведае, калі жылі дыназаўры.

## НА ТОЕ І КАТЫ...

Раніца. Тралейбус. На сядзенні насупраць — двое хлапцоў. Між сабой яны, відавочна, знаёмыя, але ж маўчаць — глядзяць у акно. І, як высветлілася, не марна:



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Валім адсюль! — камандуе раптам адзін.

А «валяць» — абодва: кулём, на злом галавы, ледзь не збіваючы з ног... кантралёрку! Тая — мажная, важная — і не думае крыўдаваць: спакойна заходзіць у салон, просіць прад'явіць білеты.

— Які зараз сэнс правяраць? — пытае адзін з пасажыраў. — Усе ж зайцы разбегліся.

— Ну і няхай, — усміхаецца жанчына. — Думаеце, лёгка з імі сабачыцца? Не... А гэтыя бач, як спужаліся. Можа, іншы раз і талоны праб'юць.

...На тое і каты, каб мышы лататы?

## РАЗУМНАЯ ЎНУЧКА

Усё змяшалася... І не толькі ў доме Аблонскіх: дзед Аркадзь з бабай Зінай месца сабе не знаходзілі. Яно і зразумела: не кожны дзень да варот пад'язджае «хуткая», не кожны дзень забірае нявестку — няхай і ў радзільню. Як яно там будзе? Каб жа добра хацят!.. Каб з дзіцяткам дадому хутчэй...

— Ты вось каго болей хочаш? — папытала бабуля ў малой ўнучкі. — Брацікa ці сястрычку?

— Бацікa, — не міргнуўшы вокам прамовіла тая.

— Дык, можа, і купяць: твае татка з мамай сёння ў краму паехалі...

Паехалі, трэба сказаць, з ранку, удваіх, а вярнуўся бацька пад вечар, адзін. З парога аб'явіў, што купілі сястрычку — брацікаў не было.

«Дзякуй Богу! Абы дзіця! Абы здаровенькае!» — узрадаваліся дзед з бабуляй. А вось унучка...

Унучка ціха заплакала ад крыўды: па-дурному ж патрачаны грошы! «Не было, ці бачыце, брацікa... Дык што — нельга было ў іншую краму пад'ехаць? — уголас разважала яна. — Або пачакаць, пакуль прывязуць. А найлепш — мяне з сабой бы ўзялі!»

...Хутка праляцеў час: надоечы тая разумная дзяўчынка сама з радзільні прыехала — свайму першынцу сястрычку прывезла — як ён і прасіў.

Дзеці — што ні кажы — за бацькоў разумнейшыя...

Бываюць.

## НЕ ДЛЯ ТАГО

Каляжанка піша вершы, піша па-руску, бо і сям'я, і школа, і ўсё атачэнне змалку былі рускамоўнымі.

Але ж ад беларускай яна таксама не адмаўляецца: чытае шмат, за кампанію спрабуе размаўляць, хоць і доўга падбіраючы словы.

Надоечы, напрыклад, узялася расказваць, як у госці з мужам хадзілі, як па дарозе купілі торт. Ды такі няўдалы... Галоўнае — побач з гэтай крамай была яшчэ адна, маглі б зайсці — часу хапала. «Але мы, — шкадуе калега, — *не сообразили...* Як гэта сказаць па-беларуску?»

Мы разам шукаем слова:

— Не сцямілі... Не скемілі... Не змікіцілі... Не дадумаліся... Можна сказаць яшчэ — не прыйшло ў галаву... Не стукнула. Не стрэліла. Альбо — не дапетрылі... Не датумкалі...

— Колькі варыянтаў! — здзіўляецца, захапляецца жанчына. — Які й выбраць?

...Нашы продкі прыдумалі іх.

Нашы класікі ды навукоўцы — занатавалі, патлумачылі...

Ну не для таго ж, каб мы гэта страцілі?!

## РЭХА

...Некалі, пачуўшы ў навінах пра новы тэракт альбо катастрофу, сяброўка штораз гаварыла: «Як добра, што ў мяне цяпер грошай няма, — я нікуды больш не паеду... Страшна».

Ёй можна было баяцца і нікуды не ехаць: яна паспела пабываць амаль ва ўсіх краінах Еўропы, убачыць Японію, Егіпет, Кітай...

А нехта нідзе не быў, нічога не бачыў.

І не ўбачыць?

## НЕ ЎСЁ ТОЕ ЗОЛАТА...

Баба Яня ўсё жыццё пражыла ў вёсцы. У горад «эмігрыравала», як сама прызнаецца, толькі ў старасці, «абязножыўшы»: у сына жыве, на сёмым паверсе, і, вядома ж, сумуе — па доме, па зямлі...

Днямі ў яе госця была — суседка з вёскі. Прысмакаў сваіх навезла — каўбас, свежага тваражку, масла.

Яму — кругленькаму, жаўтаватаму — «эмігрантка» найболей рада была: разглядала, нюхала, цмокала, казала:

— Як золатца!.. А можа нават і лепш!

Ну сапраўды... Бо золата ж не з'ясі.

## РЭКЛАМА

Прыпынак. Абвестка. Першапачаткова на ёй вялікімі літарамі было напісана: *«Балконный мастер»,* трохі меншымі — яго абяцанні давесці да ладу любую лоджыю альбо балкон: гэта значыць, зашкліць, пасл аць падлогу, падшыць столі, затынкаваць сцены...

Але ж тэлефон умельцу, мусіць, не абрывалі, таму наступную аб'яву ён удакладніў. Напісаў зверху: *«Трезвый балконный мастер».*

З часам ён жа (ці нейкі гумарыст?) дапісаў зверху — *«резвый».*

...Такому майстру ўжо можна званіць. Ці не так?

## НА ВЕЧКА...

У цёткі Ядзі з мужам згоды няма. Найперш наконт грошай, бо яна кожную «вольную» капейку тут жа ўнучкам аддала б, а ён — не, упарціцца, кажа, што маладыя самі павінны старацца, павінны зарабляць. Тады, маўляў, будуць цаніць — будуць думаць, на што патраціць.

— Дык яны ж дзяўчаткі, — не здаецца цётка, — ім хоць разарвіся цяпер: і прыбрацца хочацца, і некуды схадзіць, і прысмакаў з'есці... А нам — што ёсць, тое і смачна, што надзеў, тое і добра...

Надоечы зноўку сварыліся:

— Зацiскай, зацiскай свае грошы — можа, зноў прападуць, — крычала цётка. — А не — дык з сабой у труну забярэш, вечка знутры паклеіш, будзеш любавацца.

## РОДНЫЯ? РОЗНЫЯ

*...Год приходит и год уходит,*
*Раздробляясь на брызги дней.*
*Раньше не было нас в природе,*
*А потом нас не будет в ней.*

Гэта — Губерман. І з ім не паспрачаешся, бо ўсё тут правільна — не было нас... Не будзе. Застанецца — хіба нашчадкі (у каго яны ёсць); на нейкі час — памяць. А потым — помнік, калі трывалы. Ці крыж.

...Гэтыя два — адзін каталіцкі, другі праваслаўны — «поплеч» стаяць, у адной абгародцы. Што не дзіва, бо пад першым (мяркуючы па прозвішчах і датах жыцця) — бацька, пад другім — сын. Адна кроў... была, а вось рэлігіі — чамусьці розныя.

У сына, трэба разумець, «маміна ўзяла»?

**Валянціна ДОЎНАР** *dounar@zviazda.by*

■ Нефармат

# «НЕРЭНТАБЕЛЬНЫЯ» СТАРЫЯ

## ШТО МОЖА ВЫРАТАВАЦЬ МАЛЫЯ ВЁСКІ



**Нядаўна давялося быць на адной вялікай нарадзе, дзе гаварылася аб закрыцці сельскіх магазінаў. Лічбы прыводзяцца пераканаўчыя, аргументы слушныя. Усё, здавалася б, правільна. Калі вешаюць замок на былы гандлёвы пункт, людзі без абслугоўвання не застаюцца, да іх па графіку прыедзе аўтакрама, прывязе хлеб ды іншыя прадукты. Усё правільна, але...**

Днямі патэлефанавала даўняя чытачка і прыхільніца нашай газеты з палескай вёскі. Расказвала, як закрылі ў іх спачатку школу, потым клуб, застаўся дом сацыяльных паслуг, а цяпер аб'явілі, што і яго збіраюцца скасаваць. Перад гэтым дайшла чарга да пошты і магазіна. «Нас збіралі на сход, нам тлумачылі, што называецца, на пальцах. Мы разумеем, калі аб'екты нерэнтабельныя, то іх немэтазгодна ўтрымліваць, лічы, марна траціць грошы. Але ж каб вы ведалі, як цяжка дажываць вось у такіх умовах! Адчуваеш сябе нейкім недарэчным, лішнім у гэтым жыцці», — ноткі роспачы раз-пораз праскоквалі ў разважаннях жанчыны.

Прыкладна такое тлумачэнне, як і наша гераіня, атрымліваюць жыхары вёсак, калі маршруты рэйсавага аўтобуса прызнаюцца нерэнтабельнымі і іх здымаюць з раскладу. Зноў жа адказныя асобы становішча раскладваюць па паліцах, тлумачаць на лічбах і фактах. Старыя ўсё разумеюць, але нясмела пытаюцца: «А як жа нам у горад дабрацца ў паліклініку ці бальніцу?» Падобныя пытанні не раз гучалі на «прамых лініях», што ўвайшлі ў практыку выканаўчай улады, альбо ў пісьмовых зваротах.

Там, дзе вёска трапляе ў разрад неперспектыўных, людзі вымушаны мірыцца з абмежаваннямі. А што ім застаецца? Нават правадное радыё адключылі ў сельскіх населеных пунктах. Цікава, што ў вялікіх гарадах радыё да гэтай пары працуе, а вясковыя радыёкропкі даўно замаўчалі. Зноў жа: нерэнтабельна. Колькі разоў даводзілася чуць ад сталых людзей, што яны выраслі, жыццё пражылі з любімым радыё. Прыёмнік у многіх дамах ніколі не выключалі, вяшчанне будзіла гаспадароў а шостай раніцы. Па радыё пачулі некалі пра палёт Гагарына ў космас, пра іншыя знакавыя і важныя падзеі краіны. Бабулька, якая жыве адна, сказала неяк: «Раней яно гаворыць і гаворыць, і я нібы не адна ў хаце, а цяпер стала зусім сумна». Але да адсутнасці радыё нашы пажылыя пенсіянеры прывыклі, паступова замянілі яго на прыёмнікі, якія працуюць ад электрычнасці. Іншыя сталі больш глядзець тэлевізар.

А вось з магазінамі і аўтобусамі горш. Адзін разумны чалавек гаварыў: «Калі школу закрываюць у вёсцы, яе пачынае пакідаць жыццё». Пра тое даводзіла і наша чытачка па тэлефоне. Пачынаецца «працэс аптымізацыі» са школы, потым — клуб, пошта, нарашце — магазін. І застаюцца ў населеным пункце старыя, нярэдка адзінокія людзі, неабароненыя перад рознымі зламыснікамі, што квапяцца на іх пенсію і сціплыя зберажэнні. Такія выпадкі міліцыяй зафіксаваныя, на жаль, не толькі ў кожнай вобласці, але і ў кожным раёне.

Невялікія вёскі выміраюць. І нічога з гэтым не зробіш. Усё магло б быць інакш, калі б у сельскай мясцовасці заставалася больш маладых, яны працавалі б, будавалі дамы. Калі б нараджалася дастаткова дзяцей, школы ніхто не закрываў бы, калі б магазіны давалі добрую выручку, іх не замянялі б на аўтакрамы — жыццё працягвалася б. Тады старыя не адчувалі б сябе непатрэбнымі і «нерэнтабельнымі». Але, як той казаў, гісторыя не церпіць умоўнага ладу. Працэс ужо ідзе. Значыць, мы нешта зрабілі не так, у нечым пралічыліся, нечага недадумалі. Мы — сельская нацыя. Статыстыку ў гарадах ствараюць былыя вяскоўцы. Менавіта яны ў сваіх стандартных двух-, трохпакаёўках нараджалі апошнія дзесяцігоддзі ў сярэднім паўтара дзіцяці. Адсюль дэмаграфічныя праблемы, якія з пераменным поспехам спрабуем вырашаць з дапамогай розных праграм. А ў вясковых дамах пры ўмове стабільнай работы для бацькоў, як правіла, нараджаецца не менш за двое дзяцей, цяпер і трое — зусім не рэдкасць.

Першая ўмова аседласці на малой радзіме — рабочае месца пажадана з прыстойнай зарплатай. Нядаўна была ў вёсцы Пелішча Камянецкага раёна, дзе адкрылі прадпрыемства па перапрацоўцы мяса птушкі. Каб такія заводзікі альбо невялікія фабрыкі адкрываліся кругом, была б у вёсках іншая сітуацыя. Але дзе тыя прадпрымальнікі, актыўныя дзелавыя людзі, што забяспечылі б работай вяскоўцаў? Яны таксама з'ехалі ў горад, гандлююць на рынках альбо ў сваіх невялікіх кіёсках. Адны пабаяліся пачынаць сваю справу, бо ў нас яшчэ даволі складаныя працэдуры афармленняў і ўзгадненняў. На іншых паўплывала бацькоўская ўстаноўка — любой цаной замацавацца ў горадзе, бо там жыць лягчэй, цікавей і камфортней, перад вачыма прыклад аднакласнікаў і суседзяў.

Вось і застаюцца пустыя дамы, дажываюць свой век адзінокія старыя ў былых шматлюдных вёсках, дзе ў XXI стагоддзі ад выгод цывілізацыі нярэдка застаецца адзін ліхтар на ўсю вуліцу.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*


# ОАО «Белсельэлектросетьстрой»

Учетный номер плательщика: 100120777
Вид экономической деятельности: 45212
Организационно-правовая форма: 1131 частная
Орган управления: ГПО «БЕЛЭНЕРГО»
Единица измерения: млн руб.
Адрес: г. Минск, ул. Сухая, 3

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2015 г.

| АКТИВЫ | Код строки | На 31 декабря 2015 г. | На 31 декабря 2014 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 261 575 | 266 923 |
| Нематериальные активы | 120 | 302 | 82 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | - | 684 |
| В том числе: | | | |
| инвестиционная недвижимость | 131 | - | 684 |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | - | - |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 2 087 | 2 164 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 66 | 66 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | - | 3 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | - | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | 201 | 200 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **264 231** | **270 122** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 107 592 | 117 691 |
| В том числе: | | | |
| материалы | 211 | 74 471 | 88 920 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| незавершенное производство | 213 | 14 833 | 14 038 |
| готовая продукция и товары | 214 | 18 288 | 14 733 |
| товары отгруженные | 215 | - | - |
| прочие запасы | 216 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | 380 | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | 1 672 | 1 852 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 488 | 1 074 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 156 441 | 117 320 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | - | - |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 46 956 | 39 926 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | 41 | 33 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **313 570** | **277 896** |
| **БАЛАНС** | **300** | **577 801** | **548 018** |

| СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | Код строки | на 31 декабря 2015 г. | на 31 декабря 2014 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 113 863 | 113 863 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | 30 076 | 29 060 |
| Добавочный капитал | 450 | 178 269 | 177 542 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 39 805 | 37 830 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | - | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **362 013** | **358 295** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 14 906 | 23 386 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | - | - |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **14 906** | **23 386** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | - | - |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | 6 527 | - |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 194 355 | 166 337 |
| В том числе: | | | |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 104 640 | 94 230 |
| по авансам полученным | 632 | 53 197 | 41 344 |
| по налогам и сборам | 633 | 6 041 | 3 800 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 2 807 | 2 670 |
| по оплате труда | 635 | 10 219 | 8 489 |
| по лизинговым платежам | 636 | 2 921 | 1 438 |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | 12 736 | 12 407 |
| прочим кредиторам | 638 | 1 794 | 1 959 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **200 882** | **166 337** |
| **БАЛАНС** | **700** | **577 801** | **548 018** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–декабрь 2015 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь–декабрь 2015 года | За январь–декабрь 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 1 095 890 | 834 122 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (913 794) | (658 946) |
| Валовая прибыль (010 – 020) | 030 | 182 096 | 175 176 |
| Управленческие расходы | 040 | (86 788) | (77 931) |
| Расходы на реализацию | 050 | (4 484) | (9 868) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050) | 060 | 90 824 | 87 377 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 74 989 | 159 542 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (139 614) | (221 477) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080) | 090 | 26 199 | 25 442 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 5 032 | 5 703 |
| В том числе: | | | |
| доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 183 | 880 |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | - | 11 |
| проценты к получению | 103 | 2 157 | 1 675 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | 2 692 | 3 137 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (1 462) | (1 129) |
| В том числе: | | | |
| расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | (353) | (493) |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | (1 109) | (636) |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 16 056 | 29 651 |
| В том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 15 727 | 29 369 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | 329 | 282 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (15 148) | (28 292) |
| В том числе: | | | |
| проценты к уплате | 131 | (83) | (328) |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (14 274) | (27 442) |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | (791) | (522) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100 – 110 + 120 – 130) | 140 | 4 478 | 5 933 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 140) | 150 | 30 677 | 31 375 |
| Налог на прибыль | 160 | (14 216) | (13 598) |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | (3) | (17) |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | | |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | | |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | (26) | (27) |
| Чистая прибыль (убыток) (± 150 – 160 ± 170 ± 180 – 190 – 200) | 210 | 16 432 | 17 733 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | - | - |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | - | - |
| Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230) | 240 | 16 432 | 17 733 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | 0,014 | 0,016 |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | | |

**Руководитель** **Н.Н.АНИЩИК**

**Главный бухгалтер** **Д.Л.КОВАЛЕВА**

| 4.Доля государства в уставном фонде эмитента (всего в %): | | **77,5858** |
|---|---|---|
| **Вид собственности** | **Количество акций, шт.** | **Доля в уставном фонде, %** |
| республиканская | ***883 417*** | ***77,5858*** |

**5-6. Информация о дивидендах и акциях**

| Показатель | Единица измерения | С начала года | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | лиц | 2338 | 2329 |
| в том числе: юридических лиц | лиц | 1 | 1 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | | |
| в том числе: физических лиц | лиц | 2337 | 2328 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | | |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | миллионов рублей | 12736,00 | 12407,00 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | миллионов рублей | 11553,00 | 6445,00 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | 11185,72 | 10896,36 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну акцию (включая налоги) | рублей | 10896,36 | 5660,53 |
| Обеспеченность акции имуществом общества | тысяч рублей | 317,94 | 313,69 |
| Среднесписочная численность работающих | человек | 1683 | 1834 |

9. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (только в составе годового отчета): строительно-монтажные работы. Производство сборных ж/бетонных и бетонных изделий. Производство электрораспределительной и регулирующей аппаратуры. Производство изолированных проводов и кабелей.
10. Данные отчетности подтверждены ЧАУП «Аудит-Конто».



# ИООО «Зомекс Инвестмент»

Учетный номер плательщика: 191061449
Вид экономической деятельности: Подготовка к продаже недвижимого имущества
Организационно-правовая форма: Иностранное общество с ограниченной отвественостью
Орган управления: Юридическое лицо без ведомственной подчиненности
Единица измерения: млн. руб. Адрес: 220114, г. Минск, ул. П.Мстиславца, дом 4, пом 165, комн 2

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2015 года

| АКТИВЫ | Код строки | На 31 декабря 2015 года | На 31 декабря 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 8 763 | 8 410 |
| Нематериальные активы | 120 | 10 883 | 14 086 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | 7 033 | 810 |
| В том числе: | | | |
| инвестиционная недвижимость | 131 | 7 033 | |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | | |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | | 810 |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 1 951 923 | 769 552 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | - | - |
| Отложенные налоговые активы | 160 | 43 | - |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | - | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | 89 000 | 51 819 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **2 067 645** | **844 677** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 101 943 | 176 967 |
| В том числе: | | | |
| материалы | 211 | 15 445 | 116 077 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| незавершенное производство | 213 | - | 29 328 |
| готовая продукция и товары | 214 | 86 498 | 31 562 |
| товары отгруженные | 215 | - | - |
| прочие запасы | 216 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | 1 136 105 | 420 886 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 107 552 | 6 072 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 81 007 | 75 571 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 409 996 | 259 058 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | - | - |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 6 963 | 35 539 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **1 843 566** | **974 093** |
| **БАЛАНС** | **300** | **3 911 211** | **1 818 770** |

| Собственный капитал и обязательства | Код строки | На 31 декабря 2015 года | На 31 декабря 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 1 267 | 1 267 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | 3 692 | 3 692 |
| Добавочный капитал | 450 | - | - |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 61 898 | 1 062 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | - | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **66 857** | **6 021** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 1 839 863 | 765 369 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | - | |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | 7 137 | - |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | 765 334 | 386 786 |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **2 612 334** | **1 152 155** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | - | 30 168 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | 1 421 | - |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 1 230 374 | 630 426 |
| В том числе: | | | |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 226 364 | 27 713 |
| по авансам полученным | 632 | 975 224 | 560 704 |
| по налогам и сборам | 633 | 400 | 5 899 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 463 | 410 |
| по оплате труда | 635 | 2 148 | 1 989 |
| по лизинговым платежам | 636 | - | - |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | 1 308 | 1 308 |
| прочим кредиторам | 638 | 24 467 | 32 403 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | 225 | - |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **1 232 020** | **660 594** |
| **БАЛАНС** | **700** | **3 911 211** | **1 818 770** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь – декабрь 2015 г.

| Наименование показателей | Код строки | За январь–декабрь 2015 года | За январь–декабрь 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 152 334 | 133 220 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (26 594) | (11 562) |
| Валовая прибыль (010 – 020) | 030 | 125 740 | 121 658 |
| Управленческие расходы | 040 | (22 519) | (10 211) |
| Расходы на реализацию | 050 | - | - |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050) | 060 | 103 221 | 111 447 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 598 211 | 534 315 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (604 421) | (443 523) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080) | 090 | 97 011 | 202 239 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 753 | 48 268 |
| В том числе: | | | |
| доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 381 | 36 858 |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | - | - |
| проценты к получению | 103 | 372 | 1 562 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | - | 9 848 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (337) | (40 086) |
| В том числе: | | | |
| расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | (282) | (30 116) |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | (55) | (9 970) |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 91 979 | 19 563 |
| В том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 51 684 | 19 359 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | 40 295 | 204 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (121 469) | (179 932) |
| В том числе: | | | |
| проценты к уплате | 131 | (51 182) | (46 848) |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (68 782) | (130 832) |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | (1 505) | (2 252) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100 - 110 + 120 - 130) | 140 | (29 074) | (152 187) |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 140) | 150 | 67 937 | 50 052 |
| Налог на прибыль | 160 | | - |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | 43 | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | (7 137) | - |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | (10) | (10) |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | - | - |
| Чистая прибыль (убыток) (± 150 – 160 ± 170 ± 180 – 190 – 200) | 210 | 60 833 | 50 042 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | - | (5 230) |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | - | - |
| Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230) | 240 | 60 833 | 44 812 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | - | - |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | - | - |

***Руководитель*** ***М.Василевич***

***Главный бухгалтер*** ***Клочко Л.Л.***